**Лобач Уладзімір Аляксандравіч**
Інстытут славістыкі Польскай акадэміі навук
e-mail: uladzimir.lobach@ispan.waw.pl

## УЯЎЛЕННЕ ПРА БАГАЦЦЕ І ЗОЛАТА ЯЎРЭЯЎ У ФАЛЬКЛОРНЫМ ЛАНДШАФЦЕ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ[1]

***Анатацыя.*** Артыкул прысвечаны стэрэатыпным уяўленням беларусаў пра багацце і золата яўрэяў. Фальклорны вобраз багатага яўрэя мае грунтам традыцыйнае вясковае ўспрыняцце гандляроў і рамеснікаў як людзей, што маюць непасрэднае дачыненне да тавараў і грошай. Гандаль і рамяство, якімі займаліся прадстаўнікі яўрэйскай этнічнай групы, разумеліся беларускімі сялянамі «лёгкім» спосабам назапашвання багацця, проціпастаўленым «сапраўднай», цяжкай працы земляроба.

***Ключавыя словы:*** Паўночная Беларусь, яўрэі, беларусы, этнічныя стэрэатыпы, золата, фальклор, II Сусветная вайна.

**Uladzimir Lobach**
Institute of Slavic Studies of the Polish Academy of Sciences
e-mail: uladzimir.lobach@ispan.waw.pl

## IDEAS OF THE WEALTH AND GOLD OF THE JEWS IN THE FOLKLORE LANDSCAPE OF NORTHERN BELARUS

***Abstract.*** The article is devoted to stereotypical ideas of Belarusians about wealth and gold of Jews. The folklore image of a rich Jew is based on the traditional rural perception of merchants and artisans as people directly related to goods and money. At the same time trade and handicrafts as occupation of representatives of the Jewish ethnic group were treated by Belarusian peasants as an «easy» way of accumulating wealth, as opposed to a «real» hard work of a farmer.

***Keywords:*** Northern Belarus, Jews, Belarusians, ethnic stereotypes, gold, folklore, World War II.

Гісторыя міжкультурнага ўзаемадзеяння беларусаў і яўрэяў налічвае шмат стагоддзяў, што дазволіла прадстаўнікам абодвух народаў скласці поўнае і падрабязнае ўяўленне пра сваіх этнічных суседзяў. Ва ўмовах традыцыйнага аграрнага грамадства, з уласцівай яму міфапаэтычнай карцінай свету, характарыстыкі,

[1] The article was prepared as part of the project «Research on memory, Belarus in the context of World War II». The project is co-financed by the Polish National Agency for Academic Exchange within «Solidarity with Belarus Initiative».

даваныя беларускімі сялянамі яўрэям, адлюстроўвалі аб'ектыўную рэальнасць, але адначасова набывалі форму этнічных стэрэатыпаў і міфалагем.

Прадметам дадзенага даследвання ёсць толькі адзін аспект вобраза яўрэяў ў беларускай народнай культуры – уяўленні пра багацце і золата гэтай этнічнай групы. Фальклорнымі крыніцамі даследвання выступілі экспедыцыйныя запісы Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследванняў ПДУ, а таксама апублікаваныя матэрыялы, якія адлюстроўваюць спецыфіку межэтнічнага ўзаемадзеяння на тэрыторыі Паўночнай Беларусі ў першай палове XX ст.

Уяўленні беларусаў пра багацце яўрэяў былі неад'емна звязаныя з родам гаспадарчай дзейнасці апошніх (рамяство і гандаль), што не толькі разумелася як сфера, дзе пастаянна круцяцца грошы, але і выразна проціпастаўлялася цяжкай працы селяніна на зямлі. Больш за тое, з гледзішча земляроба, прафесійныя заняткі яўрэяў сапраўднай працай не лічыліся ўвогуле. *«Рабіць ляніліся, не хацелі. Яны болей таргаваць. Цыгане красці, а жыд таргаваць»* (Глыбоцкі р-н)[2]; *«Яны не прывыкшы работаць. Яны прывыкшы, яўрэі, к таргоўлі, там яшчо к чамунебудзь. На зямлі на крэсьцянскай яны не работалі»* (Лепельскі р-н)[3].

Асабліва выразнай выглядала бездань паміж яўрэйскай прафесійнай спецыялізацыяй і амаль прыгоннай працай сялян у калгасах. *«Чым яны (габрэі) атлічныя?* ***Арыфметычныя****, няўрэдныя. Ён (габрэй), як арыфметычны, і ён у калхоз зямлю пахаць не пойдзець. Ён будзець «анцік-цванцік-сінцік-фунцік» – вот так вот, вот так ён будзіць. Ён ня пойдзець, ці ён дурны (у калхоз) ісці? А наш раб, раз ты слабаумный, неарыфметычны, значыць, паднімі і палажы. Да яшчэ ў цябе дакументаў няма, пашпарта, вот...»* (Полацкі р-н)[4].

Нягледзячы на тое, што значная частка рэспандэнтаў вельмі высока ацэньвае прафесіяналізм яўрэйскіх рамеснікаў і гандляроў, падкрэслівае іх тактоўнасць і спагадлівасць у дачыненнях з пакупнікамі ды прызнае вялікае значэнне іх паслуг для беларускай вёскі, надзвычай устойлівым стаўся стэрэатып пра незлічоныя багацці, якія прыносіў яўрэям гандаль. Памеры таго багацця апісваюцца фальклорным чынам, калі грошы і каштоўнасці вымяраюцца вёдрамі ці бочкамі, а эфект праўдзівасці паведамлення дасягаецца фарматам «уласнага сведчання» апавядальшчыка. *«Идет (яўрэй) с магазина, уже закрытый магазин, и нясеть ведро, а то и два денег»* (Глыбокае) [3, с. 180]. *«Мама гаворыць, пашла ў Язна да жыдоўкі. А яна, гаворыць, такую бочку мыець, і такую бочку так вымываець чыста. А я і кажу, Сорка яе звалі, на што гэдак? А яна кажа: «Гэта, Шчарбіцкая, сакрэт». Ну, а мама кажыць, што яны хавалі туды залатыя вешчы і дзеньгі*

[2] Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ): Зап. У. Аўсейчык, У. Лобач у 2012 г. ад Федаровіча Васіля Ўладзіміравіча, 1926 г.н., у в. Рудакова Глыбоцкага р-на.
[3] ФА ПДУ: Зап. У. Аўсейчык у 2007 г. ад Васільевай Алены, 1926 г. н. у в. Залессе Лепельскага р-на.
[4] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач, А. Сумко у 2018 г. ад Чобат Марыі Міхайлаўны, 1927 г. н. у в. Блізніца Полацкага р-на.

*ў бочку, і закапывалі. Но дзе закапывалі, ніхто не знаў. Золата было многа, да. Яны ж таргавалі»* (Мёрскі р-н)[5].

Стэрэатып пра асаблівую любоў яўрэяў менавіта да золата, як вышэйшага эквівалента любога багацця, распаўсюджаны вельмі шырока: *«Жыды багатыя, у іх золата было»*[6]; «Яўреи, ўсё у йих. Ну ешче гаварили, што у их у каждага где-то золата... У яўрееў золата ўсегда было» [4, с. 42]. Падобнае меркаванне характэрна не толькі для беларускай народнай культуры, але і для польскіх ды ўкраінскіх вяскоўцаў. «Byli głodni na złoto… kochali się w złocie», «Oni bogate, Żydzi byli. Dużo złota mieli...» [7, s. 94]; «Еўрэи мали много золота. Наши не понимали, што то золото» [1, с. 312]. Спроба патлумачыць яўрэйскую прагу да золата і абыякавасць да яго з боку тутэйшага люду, на першы погляд, выглядае даволі анекдатычна: *«Евреи любили золото, что оно ценится, а русские иваны не любили копейки, потому что вот у рваных штанах она… потеряешь, а бумажка задерживалась. Евреи разумные люди были – жбанок ёсць – в яго. А бумажка – это пшик»* [5, с. 269]. Аднак, падобная рэпліка паказвае, што яўрэі былі абазнаныя ў рынкавай вартасці золата і разумелі ягоны кошт, як сродка акумуляцыі і захавання фінансавага капіталу, а тутэйшыя беларусы гэтакай эканамічнай мудрасцю не валодалі. І паказальным ёсць выпадак, калі беларус, якому пашчасціла адшукаць ухаванае яўрэямі золата, не прыдумаў нічога лепшага, як справіць сабе залатыя зубы [3, с. 180–181].

Апавяданні пра яўрэйскія скарбы бытуюць у ваколіцах былых мястэчак, дзе пражывала вялікая колькасць яўрэйскага насельніцтва, якое мела актыўныя кантакты з мясцовымі беларусамі. Аднак, наратывы пра ўхаваныя яўрэйскія багацці істотна адрозніваюцца ад паданняў пра скарбы, пакінутыя на беларускай зямлі французскай ці шведскай арміяй. У апошнім выпадку размова ідзе пра войны даўнія, напаўлегендарныя для беларускага вяскоўца, а міфічныя па сваёй сутнасці скарбы заўсёды суадносяцца з варожай арміяй. Скарбы і золата яўрэяў – гэта заўжды багацце ахвяраў, людзей, знішчаных нацыстамі ў часе абсалютна рэальнай і самай страшнай вайны.

«Яўрэйскае золата» ў аповядах пра вайну і акупацыю фігуруе ў двух сюжэтных лініях. У першым выпадку багацці яўрэяў узгадваюцца як плата за немцам ці мясцовым жыхарам за магчымае выратаванне. Другая лінія прысвечана ўласна скарбам – каштоўнасцям, схаваных яўрэямі ў спадзяванні калі-небудзь скарыстацца нажытымі грашыма. Але ў абодвух выпадках мае месца фальклорная гіпербалізацыя памераў яўрэйскага багацця. Так, прадстаўнікі яўрэйскага гета «вёдрамі» носяць золата немцам у спадзяванні захаваць жыццё. *«Тады [немец] стаў… И ён-то доил, доил. Вот сказал рабину, ну, священнику: стоко збярёте золота*

[5] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач і А. Сумко у 2019 г. ад Шчарбіцкай Вольгі Паўлаўны, 1934 г.н. у в. Парадні Мёрскага р-на.

[6] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2008 г. ад Ермаловіч Аліны Осіпаўны, 1933 г.н. у в. Ст. Сяло Шаркаўшчынскага р-на.

*мне – вядро – будете жить, а так – будем расстреливать. Ну, рабин скажеть – золото собирают. Золото раз. Выдоиў все их золото, выдоиў. <…> Ну а тады уж всё, нема что им доить – ну, тады ўсё, ў машину и ў Борок [место уничтожения и погребения евреев Глубокого]»* [6, с. 172].

Гэткімі ж каласальнымі ў народных апавяданнях выглядаюць і яўрэйскія скарбы. *«Тут ещё ў Глубокое с Израиля приезжал (его родители давно вывезли), говорит: если Глубокое перекопать полностью, тут… стоко золота найти можно – на десять Глубоких»* [5, с. 269]. У якасці месцаў ухавання скарбаў фігуруюць сцены, печы, сутарэнні дамоў, дзе жылі габрэі, могілкі і калодзежы. Вельмі часта такія паведамленні маюць відавочна фальклорны характар. *«Гэтых яўрэяў, когда вели на расстрел, старожилы гаворацъ, што они снимали там какие там были драгоценнасти и бросали в какой-то калодец, там где-то. Ну, и потом яго закопали, зарыли...»* (Дзісна)[7].

Гісторыі пра рэальныя знаходкі яўрэйскіх багаццяў даволі рэдка паведамляюць, што гэтыя каштоўнасці пайшлі на карысць іх новым уладальнікам. У лепшым выпадку, золата ідзе на «пустое» – залатыя зубы ці пярсцёнкі і не дае практычнай карысці. Але куды больш драматычным наступствам авалодання багаццямі забітых людзей было турэмнае зняволенне (за ухаванне скарба ад дзяржавы) ці нават містычная смерць чалавека, які пакваліўся на грошы, знойдзеныя ў пахаванні. «[Во время перезахоронения евреев в братской могиле в Черноручье находили] *ну, кароче, астатки эти там. Брошки там, медальоны. Этот сасед… сасед деду гаварить: «Вот, вот я бяру», – а там… ну, яврэйские гроши были [нрзб.]. Ну вот, гроши эти [нрзб.]. Дед гаварыть: «Паслушай, накой тебе эти гроши? У их лежать – нехай лежить, ани нам не нада. Ты памрешь», – дед мой на яго, панимаешь или нет? Ну, дед што-то знаў же. Ну той: «Ай! Прыгадятся!» И через год той мужик памёр. Никада ў жизни не бяры с пакойника ничого. Не бяры никада ў жизни»* [4, с. 42].

З другога боку, нельга не ўзгадаць такую прыкрую рэалізацыю міфа пра яўрэйскія багацці, як скарбашукальніцтва на могілках. Спецыфічныя гаспадарчыя заняткі яўрэяў (рамяство, гандаль, фінансы), а таксама даволі манументальныя і дарагія надмагіллі (мацэвы) спарадзілі ў мясцовага насельніцтва ўстойлівае «уяўленне пра тое, што яўрэі хаваюць нябожчыкаў разам з нажытым багаццем. Гэты «міф» і з’яўляецца, відаць, пастаянным і моцным стымулам да разрабавання яўрэйскіх могілак і разбурэння надмагільных помнікаў. Сляды абрабаваных магіл на закінутых яўрэйскіх могілках – відавочнае таму пацверджанне» [2, с. 221]. У дадзеным выпадку трэба пазначыць, што падобныя праявы вандалізму не мелі антысеміцкага характару, але былі вынікам дэградацыі і разбурэння традыцыйных

[7] ФА ПДУ: Зап. У. Лобач у 2019 г. ад ад Леановіча Сцяпана Сцяпанавіча, 1946 г.н. у г. Дзісна Мёрскага р-на.

маральна-этычных прынцыпаў у савецкую эпоху, калі апаганьванню і разбурэнню падлягалі як склепы магнатаў, шляхты, духавенства, так і магілы яўрэяў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Белова, О. В., Петрухин, В. Я. «Еврейский миф» в славянской культуре / О. В. Белова, В. Я. Петрухин. – М. : Мосты культуры; Иерусалим: Гешарим, 2008. – 576 с.
2. Белова, О. Сакральное пространство на фоне поликультурного ландшафта / О. Белова // Сакральная география в славянской и еврейской культурных традициях. Сб. статей. Академическая серия. Вып. 22. – М., 2008. – С. 208–224.
3. Белова, О. Быт и повседневность еврейского Глубокого / О. Белова // Глубокое: память о еврейском местечке / Отв. ред. И. Копченова. – М. : Сэфер, 2017. – С. 177–220.
4. Мороз, А. Еврейский Лепель глазами сельских жителей / А. Мороз // Лепель: память о еврейском местечке / Отв. ред. С. Амосова. – М. : Центр «Сэфер», Ин-т славяноведения РАН, 2015. – С. 35–52.
5. Мороз, А. «Столько истории в этих стенах…»: История Глубокого через призму истории одного дома / А. Мороз // Глубокое: память о еврейском местечке / Отв. ред. И. Копченова. – М. : Сэфер, 2017. – С. 265–274.
6. Савина, Н. Заметки о локальном тексте Глубокого / Н. Савина // Глубокое: память о еврейском местечке / Отв. ред. И. Копченова. – М. : Сэфер, 2017. – С. 153–176.
7. Łaszkiewicz, M. Stereotypy etniczne w polskiej kulturze ludowej / M. Łaszkiewicz. – Lublin : Wyd. UMCS, 2021. – 419 s.